# ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*19 верасня 2008 г. № 1372*

**Аб некаторых пытаннях стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў мануменальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва**

Изменения и дополнения:

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 8 июня 2011 г. № 732 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 67, 5/33929);

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 мая 2012 г. № 409 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2012 г., № 53, 5/35651)

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

Палажэнне аб Рэспубліканскім мастацка-экспертным савеце па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву.

2. Прызнаць страціўшымі сілу:

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 верасня 2000 г. № 1393 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку праектавання, стварэння (будаўніцтва), рэканструкцыі і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2000 г., № 88, 5/4026);

пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 жніўня 2003 г. № 1075 «Аб унясенні змяненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 верасня 2000 г. № 1393 і зацвярджэнні Палажэння аб Рэспубліканскім мастацка-экспертным савеце па манументальнаму мастацтву і складу Рэспубліканскага мастацка-экспертнага савета па манументальнаму мастацтву» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2003 г., № 94, 5/12924).

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

***Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь*** ***С.Сідорскі***

*ЗАЦВЕРДЖАНА*

*Пастанова*
*Савета Міністраў*
*Рэспублікі Беларусь*
*19.09.2008 № 1372*

# ПАЛАЖЭННЕ
**аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеным Палажэннем устанаўліваецца парадак стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Да манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва адносяцца манументальная скульптура, манументальна-дэкаратыўная скульптура, манументальны жывапіс, дэкаратыўна-аздабленчыя формы, мастацкія тканіны.

Манументальная скульптура - творы (мемарыяльныя ансамблі, манументы-помнікі, помнікі, помнікі-бюсты, надмагільныя помнікі, мастацка-архітэктурныя збудаванні ў месцах пахавання, мемарыяльныя дошкі, памятныя дошкі і знакі, мемарыяльныя пліты, помнікі-стэлы, статуі, якія маюць самастойнае значэнне або ўваходзяць у структуру ансамбля і з'яўляюцца яго часткай), прысвечаныя важнай гістарычнай падзеі або вядомым дзеячам, якія ствараюцца для ўстаноўкі на адкрытай прасторы і звонку будынкаў па-за межамі памяшканняў.

Манументальна-дэкаратыўная скульптура - творы (статуі, рэльефы, іншыя скульптурныя формы, што маюць самастойнае значэнне ці выконваюць ролю архітэктурных элементаў, скульптурная арнаментацыя будынкаў), якія прызначаны для аздаблення фасадаў і інтэр'ераў збудаванняў, ландшафтна-прыроднага асяроддзя, плошчаў, вуліц, маюць дэкаратыўны характар, канкрэтызуюць архітэктурны вобраз.

Манументальны жывапіс - творы (карціна, мазаіка, вітраж, роспіс і іншыя), выкананыя ў тэхніках фрэскі, мазаікі, вітражу, тэмпернага, алейнага, васковага жывапісу, у змешанай тэхніцы, сграфіта, прызначаныя для канкрэтнага архітэктурнага асяроддзя.

Дэкаратыўна-аздабленчыя формы - мастацка-дэкаратыўныя і дызайнерскія работы выяўленчага характару з металу, керамікі, шкла, дрэва, каменю і іншых матэрыялаў, выкананыя ў тэхніках ліцця, коўкі, дзіфоўкі, чаканкі, інтарсіі (вазы, рашоткі, агароджы, флюгеры, элементы паркавага аздаблення і іншыя), якія маюць адносна самастойнае значэнне і прызначаны для архітэктурнага ці ландшафтнага асяроддзя.

Мастацкія тканіны - габелены, тэкстыльныя пано, дываны, шпалеры, заслоны, тканіны абівачныя, выкананыя ў тэхніках ткацкай, дывановай, аплікацыі, вышыўкі, пляцення, прызначаныя для канкрэтнага інтэр'ера.

3. Творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва прызначаны для:

увекавечвання памяці аб важнейшых гістарычных і грамадскіх падзеях, знамянальных датах сусветнай і айчыннай гісторыі і культуры, вядомых дзяржаўных,

палітычных, грамадскіх, ваенных дзеячах, народных героях, дзеячах навукі, мастацтва і культуры;

вырашэння ідэалагічных, адукацыйна-асветніцкіх, выхаваўчых задач;

фарміравання мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі эстэтычнага асяроддзя, аздаблення і арганізацыі архітэктурнага ці ландшафтнага асяроддзя.

4. Стварэнне (рэканструкцыя) і ўстаноўка твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ажыццяўляецца па заказу дзяржаўных органаў, дзяржаўных арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый і фізічных асоб (далей - заказчыкі) на падставе заключаных дагавораў на выкананне работ па стварэнню (рэканструкцыі) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (далей - дагавор).

Стварэнне (рэканструкцыя) твораў манументальнай скульптуры (незалежна ад крыніцы фінансавання) і манументальна-дэкаратыўнай скульптуры (за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў) ажыццяўляецца на падставе заключэння Міністэрства культуры.

Для атрымання заключэння Міністэрства культуры мясцовы выканаўчы і распарадчы орган накіроўвае ў дадзенае Міністэрства пісьмо-зварот з абгрунтаваннем неабходнасці стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі твора манументальнай або манументальна-дэкаратыўнай скульптуры.

Міністэрства культуры ў 15-дзённы тэрмін пасля атрымання пісьма-звароту дае заключэнне аб мэтазгоднасці (немэтазгоднасці) стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі твора манументальнай або манументальна-дэкаратыўнай скульптуры.

Пры гэтым улічваюцца:

сувязь твора манументальна-дэкаратыўнай скульптуры з нацыянальнай культурай Рэспублікі Беларусь;

значэнне для Рэспублікі Беларусь асобы (гістарычнай падзеі), у гонар якой плануецца ўстанавіць твор манументальнай скульптуры;

увекавечанне памяці аб дадзенай асобе (гістарычнай падзеі) у існуючых творах манументальнай скульптуры, назвах вуліц, паркаў, сквераў, населеных пунктаў і іншым;

магчымасці фінансавання стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі твора манументальнай скульптуры;

іншыя абставіны.

5. Дадзенае Палажэнне не распаўсюджваецца на надмагільныя помнікі, якія ўстанаўліваюцца па заказу фізічных асоб за ўласны кошт, акрамя тых, што ўстанаўліваюцца на тэрыторыі мемарыяльных комплексаў, ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцей.

## ГЛАВА 2
## СТВАРЭННЕ (РЭКАНСТРУКЦЫЯ) І ЎСТАНОЎКА ТВОРАЎ МАНУМЕНТАЛЬНАЙ СКУЛЬПТУРЫ

6. Стварэнне (рэканструкцыя) твораў манументальнай скульптуры і ўстаноўка іх на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў на падставе заключэння Міністэрства культуры.

7. Рашэнне мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб стварэнні (рэканструкцыі) і ўстаноўцы твораў манументальнай скульптуры прымаецца:

па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь - мемарыяльных ансамбляў, манументаў-помнікаў, помнікаў, а таксама помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў, якія ствараюцца ў абласных цэнтрах і г. Мінску;

па ўзгадненню з абласнымі выканаўчымі камітэтамі - помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў, якія ствараюцца на тэрыторыях абласцей, за выключэннем абласных цэнтраў.

8. Узгадненне рашэння аб стварэнні (рэканструкцыі) і ўстаноўцы твораў манументальнай скульптуры, названых у пункце 7 дадзенага Палажэння, ажыццяўляецца пасля атрымання заключэння Міністэрства культуры.

Для ўзгаднення рашэння аб стварэнні (рэканструкцыі) і ўстаноўцы твораў манументальнай скульптуры на тэрыторыях абласцей, за выключэннем абласных цэнтраў, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі прадстаўляюцца ў абласныя выканаўчыя камітэты:

пісьмо-зварот аб узгадненні рашэння;

даведка-абгрунтаванне неабходнасці стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі твораў манументальнай скульптуры, у тым ліку з вызначэннем крыніц і памераў фінансавання;

заключэнне Міністэрства культуры;

іншыя інфармацыйныя матэрыялы.

Для ўзгаднення рашэння аб стварэнні (рэканструкцыі) і ўстаноўцы твораў манументальнай скульптуры ў абласных цэнтрах і г. Мінску абласныя выканаўчыя камітэты, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт накіроўваюць на разгляд Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь дакументы, названыя ў частцы другой дадзенага пункта.

9. Стварэнне твораў манументальнай скульптуры для ўстаноўкі іх за межамі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца па рашэнню Міністэрства культуры пры згодзе кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы, на тэрыторыі якой плануецца ўстанавіць твор манументальнай скульптуры. Устаноўка дадзеных твораў ажыццяўляецца па ўзгадненню з Міністэрствам замежных спраў.

Пры гэтым стварэнне такіх твораў манументальнай скульптуры, як мемарыяльныя ансамблі, манументы-помнікі, помнікі, помнікі-бюсты, надмагільныя помнікі, ажыццяўляецца па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## ПРАЕКТАВАННЕ ТВОРАЎ МАНУМЕНТАЛЬНАГА І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА, ПАРАДАК АДБОРУ ПРАЕКТАЎ, ІХ САСТАЎ

10. Для стварэння (рэканструкцыі) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва распрацоўваецца іх эскізны праект.

Эскізны праект ствараецца ў мэтах вызначэння вобразна-мастацкай задумы, архітэктурна-прасторавай кампазіцыі, канструкцыйнага рашэння, прыкладнага кошту твора манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і павінен уключаць фізічныя параметры і параметры яго прасторавага размяшчэння.

11. Адбор эскізных праектаў твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, за выключэннем твораў манументальнай скульптуры, праводзіцца заказчыкам на падставе экспертнага заключэння абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў.

Адбор эскізных праектаў твораў манументальнай скульптуры праводзіцца заказчыкам пасля прыняцця адпаведнага рашэння выканаўчымі і распарадчымі органамі на падставе экспертнага заключэння:

Рэспубліканскага мастацка-экспертнага савета па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву (далей - Рэспубліканскі савет) - для твораў, якія ствараюцца (рэканструююцца) і ўстанаўліваюцца ў абласных цэнтрах і г. Мінску па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў - для іншых твораў.

Адбор эскізных праектаў твораў манументальнага мастацтва для ўстаноўкі іх за межамі Рэспублікі Беларусь праводзіцца заказчыкам на падставе экспертнага заключэння Рэспубліканскага савета.

Прадстаўленне эскізных праектаў для заключэння мастацка-экспертных саветаў ажыццяўляецца заказчыкам.

12. Палажэнне аб парадку работы Рэспубліканскага савета зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў - абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі.

Склад Рэспубліканскага савета зацвярджаецца Міністэрствам культуры, абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў - абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі па ўзгадненню з Міністэрствам культуры.

Склад мастацка-экспертных саветаў фарміруецца з ліку вядучых дзеячаў выяўленчага мастацтва, архітэктараў, мастацтвазнаўцаў, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.

Пры гэтым у склад абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў уключаецца не менш за двух прадстаўнікоў Рэспубліканскага савета. Склад мастацка-экспертных саветаў зацвярджаецца на 3 гады. Пры чарговым зацвярджэнні змяненню падлягае не менш за адну трэцюю складу савета.

13. У выпадках, звязаных са стварэннем найбольш значных і складаных па тэматыцы і кампазіцыі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, заказчык праводзіць конкурс эскізных праектаў (далей - конкурс).

У выпадку стварэння твораў манументальнай скульптуры конкурс праводзіцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі або Міністэрствам культуры. Парадак арганізацыі і правядзення такога конкурсу, склад журы конкурсу зацвярджаюцца адпаведна мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі або Міністэрствам культуры. Пры гэтым у склад журы конкурсу абавязкова ўключаюцца прадстаўнікі Рэспубліканскага савета і Міністэрства культуры.

14. Эскізны праект для найбольш значных і складаных па тэматыцы і кампазіцыі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (а для іншых твораў - пры неабходнасці) павінен уключаць:

сітуацыйны план (выкапіроўка з генеральнага плана) у маштабе 1:500;

эскіз кампазіцыйнага рашэння (для скульптуры - у мяккім матэрыяле) у маштабе не менш за 1:10;

планы памяшканняў (участкаў) у маштабе 1:200-1:20;

фасады (разгорткі сцен) у маштабе 1:200-1:20;

столі памяшканняў у маштабе 1:200-1:20;

выява перспектывы ці спрошчаны макет;

генеральны план у маштабе 1:500;

план збудавання ў маштабе 1:200-1:20;

разбівачныя чарцяжы з прывязкай восей да існуючай сітуацыі, чарцяжы вертыкальнай планіроўкі і добраўпарадкавання тэрыторыі;

агульны план;

малюнкі для выканання мадэлей дэкаратыўных элементаў (картушы, фрызы, устаўкі і іншае);

тлумачальная запіска з разлікам прыкладнага кошту;

агульная тлумачальная запіска з кароткім апісаннем рашэнняў з прывядзеннем асноўных разліковых даных па канструкцыях і інжынернаму абсталяванню (пры неабходнасці).

15. Кошт усіх работ, звязаных з праектаваннем і стварэннем (рэканструкцыяй) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў матэрыяле (натуры), уключаючы іх устаноўку, а таксама прадугледжаных праектам будаўніча-мантажных работ вызначаецца калькуляцыямі і (або) каштарыснай дакументацыяй.

16. Пры вызначэнні кошту работ і паслуг, звязаных з праектаваннем, стварэннем (рэканструкцыяй) і ўстаноўкай твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, улічваюцца ў тым ліку наступныя работы і паслугі:

распрацоўка эскізнага праекта;

выкананне рабочага праекта і канструктыўнай часткі;

выкананне твораў у матэрыяле (натуры);

ажыццяўленне будаўніча-мантажных работ, прадугледжаных эскізнымі і рабочымі праектамі;

аўтарскае кіраўніцтва пры ўстаноўцы твораў;

ажыццяўленне экспертызы (у тым ліку праезд, харчаванне, пражыванне членаў мастацка-экспертных саветаў);

іншыя работы і паслугі, звязаныя з праектаваннем, стварэннем (рэканструкцыяй) і ўстаноўкай твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

17. Выключаны.

## ГЛАВА 4
## ПАРАДАК ЗАЦВЯРДЖЭННЯ ЭСКІЗНЫХ ПРАЕКТАЎ ТВОРАЎ МАНУМЕНТАЛЬНАГА І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА

18. Адабраныя эскізныя праекты твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія ствараюцца для ўстаноўкі на адкрытай прасторы і звонку будынкаў, па-за межамі памяшканняў, зацвярджаюцца іх заказчыкамі пасля ўзгаднення з адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

19. Эскізныя праекты рэканструкцыі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва зацвярджаюцца ў парадку, вызначаным у пункце 18 дадзенага Палажэння, акрамя праектаў рэканструкцыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія ўзгадняюцца і зацвярджаюцца ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

## ГЛАВА 5
## ВЫКАНАННЕ РАБОТ ПА СТВАРЭННЮ (РЭКАНСТРУКЦЫІ) ТВОРАЎ МАНУМЕНТАЛЬНАГА І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА

20. Работа аўтара (калектыву аўтараў) па стварэнню (рэканструкцыі) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва выконваецца паэтапна:

выкананне эскізнага праекта;

выкананне рабочай мадэлі (рабочага эскізу);

выкананне мадэлі (кардону) у натуральную велічыню;

выраб твора ў матэрыяле.

Фактычнае выкананне аб'ёмаў работы аўтара (калектыву аўтараў) вызначаецца па кожнаму этапу на падставе экспертных заключэнняў:

Рэспубліканскага савета - для твораў, якія ствараюцца і ўстанаўліваюцца ў абласных цэнтрах і г. Мінску па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў - для іншых твораў.

21. Выканаўца твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва вызначаецца заказчыкам у межах ажыццяўлення творчага праекта (творчай дзейнасці) у галіне культуры і мастацтва.

Выканаўцамі могуць быць фізічныя або юрыдычныя асобы, якія маюць адпаведную кваліфікацыю і права на ажыццяўленне работ па стварэнню твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і заключылі дагавор з заказчыкам.

22. Выкананне будаўнічых работ, звязаных з устаноўкай твораў манументальнай скульптуры, ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам у галіне архітэктуры, горадабудаўніцтва і будаўніцтва.

## ГЛАВА 6
## ФІНАНСАВАННЕ РАБОТ ПА СТВАРЭННЮ (РЭКАНСТРУКЦЫІ) ТВОРАЎ МАНУМЕНТАЛЬНАГА І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА

23. Фінансаванне стварэння (рэканструкцыі) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, пачынаючы з праектавання, можа ажыццяўляцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

24. Памер аўтарскага ганарару за стварэнне (рэканструкцыю) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам і на падставе рэкамендацый Рэспубліканскага савета або абласных і Мінскага гарадскога мастацка-экспертных саветаў.

25. Выключаны.

26. Канчатковыя разлікі па дагаворах з аўтарамі і выканаўцамі ажыццяўляюцца пасля падпісання акта дзяржаўнай прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

Канчатковыя разлікі за выкананне работы аўтара (калектыву аўтараў) па стварэнню твораў манументальнага мастацтва для ўстаноўкі за межамі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца на падставе экспертнага заключэння Рэспубліканскага савета аб гатоўнасці твора.

## ГЛАВА 7
## ПРЫЁМКА ТВОРАЎ МАНУМЕНТАЛЬНАГА І МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА

27. Пасля стварэння (рэканструкцыі) і ўстаноўкі на месцы твора манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва заказчык прызначае рабочую камісію для вызначэння яго гатоўнасці, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі заказчыка, выканаўцы, аўтары ці калектыў аўтараў. Рабочая камісія складае акт аб гатоўнасці твора да дзяржаўнай прыёмкі.

28. Дзяржаўная прыёмка твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ажыццяўляецца дзяржаўнымі камісіямі, склад якіх фарміруецца з членаў мастацка-экспертных саветаў, прадстаўнікоў заказчыка, дзяржаўных органаў, грамадскасці і зацвярджаецца:

Міністэрствам культуры - для прыёмкі твораў, якія ствараюцца (рэканструююцца) і ўстанаўліваюцца ў абласных цэнтрах і г. Мінску па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі - для прыёмкі іншых твораў.

29. Дзяржаўная прыёмка твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва афармляецца актам, які павінен змяшчаць:

падставу для стварэння твора;

кароткае апісанне твора, які прымаецца, у цэлым і ў асноўных элементах;

акт прыёмкі будаўнічых і мантажных работ (пры неабходнасці);

звесткі пра аўтараў ці калектыў аўтараў;

звесткі аб выканаўцы (выканаўцах) работ;

звесткі аб выкананых работах у адпаведнасці з зацверджаным каштарысам;

пералік выяўленых недахопаў з устанаўленнем тэрмінаў іх выпраўлення (ліквідацыі);

ацэнку мастацкіх вартасцей твора і якасці работы, заключэнне аб мэтазгоднасці перадачы твора пад дзяржаўную ахову ва ўстаноўленым парадку;

вывады і прапановы.

30. Заказчык прадстаўляе дзяржаўнай камісіі па прыёмцы твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва:

каштарыс і рабочыя чарцяжы;

акт на земляныя работы (пры неабходнасці);

акт устаноўкі твора;

акт добраўпарадкавання тэрыторыі (пры неабходнасці);

фатаграфіі выкананага твора;

акт рабочай камісіі аб гатоўнасці твора да дзяржаўнай прыёмкі.

31. Прыём у эксплуатацыю (адкрыццё) будынкаў і збудаванняў, якія адносяцца да твораў манументальнай скульптуры, ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам у галіне архітэктуры, горадабудаўніцтва і будаўніцтва, пасля падпісання акта дзяржаўнай прыёмкі.

32. Акт дзяржаўнай прыёмкі складаецца ў двух экземплярах, адзін з якіх перадаецца выканаўцу работ, другі - заказчыку.

33. У выпадку, калі твор не адпавядае зацверджанаму эскізнаму праекту, не мае належных мастацкіх вартасцей, дзяржаўная камісія ў спецыяльным заключэнні абгрунтоўвае сваю адмову ад дзяржаўнай прыёмкі і інфармуе аб гэтым орган, які прызначыў дзяржаўную камісію, для прыняцця адпаведнага рашэння.

34. Арганізацыі, на баланс якіх перадаюцца творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, нясуць адказнасць за іх захаванасць.

35. Творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва вялікай мастацкай значнасці паступаюць пад дзяржаўную ахову ва ўстаноўленым парадку.

36. За парушэнне дадзенага Палажэння, устаноўку твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва без належнага ўзгаднення вінаватыя нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам. Творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія ўстаноўлены самавольна або не прайшлі дзяржаўную прыёмку ва ўстаноўленым парадку, падлягаюць дэмантажу.

*ЗАЦВЕРДЖАНА*

*Пастанова*
*Савета Міністраў*
*Рэспублікі Беларусь*
*19.09.2008 № 1372*
*(у рэдакцыі пастановы*
*Савета Міністраў*
*Рэспублікі Беларусь*
*08.06.2011 № 732)*

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб Рэспубліканскім мастацка-экспертным савеце па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву**

1. Рэспубліканскі мастацка-экспертны савет па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву (далей - Рэспубліканскі савет) з'яўляецца пастаянна дзеючым дарадча-рэкамендацыйным органам.

2. Асноўнымі задачамі Рэспубліканскага савета з'яўляюцца падрыхтоўка экспертных заключэнняў, а таксама выпрацоўка практычных рэкамендацый, звязаных з праектаваннем, стварэннем (рэканструкцыяй) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

3. Рэспубліканскі савет у сваёй дзейнасці кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дадзеным Палажэннем.

4. У мэтах выканання сваіх задач Рэспубліканскі савет дае:

экспертныя заключэнні па эскізных праектах твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва;

практычныя рэкамендацыі, якія садзейнічаюць якаснай рэалізацыі творчай задумы аўтара (калектыву аўтараў);

заключэнне па этапах выканання работы аўтарам (калектывам аўтараў) па стварэнню (рэканструкцыі) твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія ствараюцца (рэканструююцца) у абласных цэнтрах і г. Мінску;

рэкамендацыі аб неабходнасці павелічэння (памяншэння) аўтарскага ўзнагароджання ў залежнасці ад мастацкага ўзроўню твора;

экспертныя заключэнні аб завершанасці работы аўтара (калектыву аўтараў) па стварэнню твораў манументальнага мастацтва для ўстаноўкі за межамі Рэспублікі Беларусь.

5. Рэспубліканскі савет адхіляе праекты твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія не адпавядаюць высокаму вобразна-мастацкаму ўзроўню або належнаму архітэктурна-кампазіцыйнаму рашэнню ці выкананы з парушэннем існуючага парадку іх стварэння (рэканструкцыі).

6. На пасяджэнні Рэспубліканскага савета прысутнічаюць прадстаўнікі заказчыка, аўтары або аўтарскі калектыў, выканаўцы, пры неабходнасці запрашаюцца прадстаўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, органаў дзяржаўнага кіравання, творчых саюзаў, навуковых і грамадскіх арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі.

7. Рэспубліканскі савет узначальвае старшыня. Старшыня мае намесніка, які ў яго адсутнасць кіруе работай Рэспубліканскага савета. Рэспубліканскі савет мае няцотную колькасць членаў, але не больш за 17 чалавек з улікам старшыні.

Склад Рэспубліканскага савета зацвярджаецца Міністэрствам культуры. У яго ўваходзяць вядучыя дзеячы выяўленчага мастацтва, архітэктары, мастацтвазнаўцы, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.

8. Пасяджэнні Рэспубліканскага савета праводзяцца па меры неабходнасці. Пры неабходнасці старшыня Рэспубліканскага савета, а ў яго адсутнасць - намеснік старшыні, прызначае рабочую экспертную групу з членаў Рэспубліканскага савета і іншых спецыялістаў, якая рыхтуе праект экспертнага заключэння Рэспубліканскага савета па асобных пытаннях і выносіць яго для абмеркавання і зацвярджэння на чарговым пасяджэнні Рэспубліканскага савета.

9. Рашэнні Рэспубліканскага савета прымаюцца простай большасцю галасоў і лічацца правамоцнымі пры ўмове прысутнасці на пасяджэнні не менш за адну другую складу Рэспубліканскага савета і афармляюцца пратаколам.

10. Прадстаўленне матэрыялаў для іх разгляду Рэспубліканскім саветам, работу Рэспубліканскага савета і кантроль за выкананнем яго рашэнняў забяспечвае Міністэрства культуры.